# РЫЖСКІ МІРНЫ ДАГАВОР 1921 г. І ЕЎРАПЕЙСКАЯ ДЫПЛАМАТЫЯ Ў 1918 – 1921 гг.

**УДК 93/94**

## ПАЛЕСКІ ПАХОД 1920 г. ГЕНЕРАЛА С.Н. БУЛАК-БАЛАХОВІЧА Ў АЦЭНКАХ ДЗЕЯЧАЎ НАЙВЫШЭЙШАЙ І НАРОДНАЙ РАДЫ БНР

***Я.А. Бодрыкаў***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, yaugen.bodrykau@yandex.by*

Палескі паход 1920 г. генерала С.Н. Булак-Балаховіча стаў заўважнай падзеяй у грамадска-палітычным жыцці многіх дзеячаў беларускага нацыянальнага руху. Большасць прадстаўнікоў беларускіх нацыянальных арганізацый і партый сустрэлі весткі аб пачатку кампаніі С.Н. Булак-Балаховіча стрымана-нейтральна або адмоўна, а ў пазнейшы час пераважалі ўжо цалкам негатыўныя ацэнкі гэтай падзеі. Такая рэакцыя была выклікана як дзеяннямі самога С.Н. Булак-Балаховіча, так і недаверам да знешніх сіл, на якія абапіраўся генерал.

***Ключавыя словы:*** *Палескі паход 1920 г.; Беларуская Народная Рэспубліка; Найвышэйшая Рада; Народная Рада.*

## ПОЛЕССКИЙ ПОХОД 1920 г. ГЕНЕРАЛА С.Н. БУЛАК-БАЛАХОВИЧА В ОЦЕНКАХ ДЕЯТЕЛЕЙ НАИВЫСШЕЙ И НАРОДНОЙ РАДЫ БНР

***Е.А. Бодриков***

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, yaugen.bodrykau@yandex.by*

Полесский поход 1920 г. генерала С.Н. Булак-Балаховича стал заметным событием в общественно-политической жизни многих деятелей белорусского национального движения. Большинство представителей белорусских национальных организаций и партий встретили известия о начале кампании С.Н. Булак-Балаховича сдержанно-нейтрально или отрицательно, а позже преобладали уже полностью негативные оценки этого события. Такая реакция была вызвана действиями С.Н. Булак-Балаховича и недоверием к внешним силам, на которые опирался генерал.

***Ключевые слова:*** *Полесский поход 1920 г.; Белорусская Народная Республика; Наивысшая Рада; Народная Рада.*

## THE PALIESSIE CAMPAIGN OF 1920 OF GENERAL S. N. BULAK-BALAKHOVICH IN THE ASSESSMENTS OF THE MEMBERS OF THE HIGHEST AND PEOPLE'S RADA OF THE BPR

***Y. Bodrykau***

*Belarusian State University, Niezaliežnasci Ave., 4, 220030, Minsk, Belarus, yaugen.bodrykau@yandex.by*

Paliessie campaign of 1920 of General S.N. Bulak-Balakhovich became a notable event in the social and political life of many figures of the Belarusian national movement. The majority of representatives of Belarusian national organizations and parties met the news about the beginning of the campaign of S.N. Bulak-Balakhovich restrained neutral or negatively, and later completely negative assessments of this event prevailed. This reaction was caused by the actions of S.N. Bulak-Balakhovich, and distrust of the external forces on which the general relied.

***Keywords:*** *Paliessie campaign of 1920; Belarusian People's Republic (BPR); Highest Rada; People's Rada.*

Адным з найважнейшых наступстваў Першай сусветнай вайны стала стварэнне шматлікіх нацыянальных дзяржаў і дзяржаўных утварэнняў у Еўропе. Ужо ў канцы 1917 – пачатку 1918 гг. пачаўся працэс распаду расійскай дзяржавы, які суправаджаўся нямецкай акупацыяй значнай часткі заходніх губерняў былой Расійскай імперыі. У гэтых умовах 9 сакавіка 1918 г. Выканаўчым камітэтам Рады Усебеларускага з'езда, які аб'ядноўваў значную частку беларускіх грамадска-палітычных дзеячаў, было абвешчана аб стварэнні Беларускай Народнай Рэспублікі (далей – БНР), 25 сакавіка 1918 г. была абвешчана незалежнасць БНР. Аднак, германскія акупацыйныя ўлады, кіраўніцтва краін Антанты і кіраўніцтва Савецкай Расіі юрыдычна не прызналі існаванне новай дзяржавы ва Усходняй Еўропе.

Ва ўмовах нямецкай акупацыі 1918 г. кіраўніцтва БНР не здолела дасягнуць рэальнай незалежнасці і самастойнасці рэспублікі. У 1919 г. беларускія землі сталі арэнай баявых дзеянняў паміж польскімі і савецкімі войскамі, што таксама не спрыяла ажыццяўленню праекта пабудовы незалежнай беларускай дзяржавы. Акрамя таго, у другой

палове 1919 г. у Радзе БНР узмацніліся спрэчкі паміж прыхільнікамі і праціўнікамі збліжэння БНР з Польскай Рэспублікай, што ў выніку прывяло да сапраўднага расколу Рады на Найвышэйшую Раду БНР і Народную Раду БНР. Адпаведна, было створана і два асобных урады: кабінет міністраў на чале з А.І. Луцкевічам (Найвышэйшая Рада БНР) імкнуўся вырашыць лёс Беларусі дыпламатычным шляхам, у тым ліку праз шчыльныя дамоўленасці з Польскай Рэспублікай; у той час як урад В.Ю. Ластоўскага (Народная Рада БНР) меў яскрава антыпольскі і пралітоўскі характар. Такая пазіцыя з боку Народнай Рады БНР прывяла да рэпрэсій у адносінах да некаторых яе членаў з боку польскіх уладаў, у той час як Найвышэйшая Рада БНР атрымлівала грашовыя субсідыі ад урада Польскай Рэспублікі [10, с. 161–166].

Значныя карэкціроўкі ў планы ўсіх зацікаўленых у беларускім пытанні бакоў унеслі баявыя дзеянні 1920 г. на савецка-польскім фронце. У гэты ж час, летам 1920 г., удзел у баявых дзеяннях на польскім баку прыняў атрад генерала С.Н. Булак-Балаховіча, які пры пасрэдніцтве дыпламатаў БНР быў пераведзены з Эстоніі. Пасля абароны Варшавы і паспяховага контрнаступлення польскіх войскаў у жніўні – верасні 1920 г. кіраўнік Польскай Рэспублікі Ю. Пілсудскі вырашыў рэалізаваць свае праекты па далучэнні да Польшчы беларускіх і літоўскіх земляў. У гэтых планах генералу С.Н. Булак-Балаховічу выпала роля кіраўніка «беларускай» арміі, якая павінна была самастойна (пры негалоснай матэрыяльна-тэхнічнай дапамозе польскага боку) захапіць тэрыторыю Беларусі ці частку беларускіх земляў [3, с. 151–152]. Менавіта Палескі паход 1920 г. генерала С.Н. Булак-Балаховіча стаў няўдалай спробай рэалізацыі гэтых планаў.

Асноўнымі аспектамі даследавання Палескага паходу 1920 г. у гістарыяграфіі з’яўляюцца баявыя дзеянні лістапада – снежня 1920 г., уплыў паходу на беларуска-польскія і польска-савецкія адносіны. Сярод айчынных даследчыкаў, якія займаліся дадзенай праблематыкай, варта вылучыць А.П. Грыцкевіча [2] і А.М. Чарнякевіча [7–10]. Сярод замежных гісторыкаў трэба адзначыць польскую даследчыцу Д. Міхалюк [6] і польскага даследчыка беларускага паходжання А. Латышонка [3].

Варта адзначыць, што яшчэ за некалькі месяцаў да ўзброенага выступлення вакол С.Н. Булак-Балаховіча пачалі гуртавацца розныя антыбальшавіцкія сілы. У жніўні 1920 г. генерал заключыў дамову з

вядомым расійскім палітыкам Б.В. Савінкавым і яго Расійскім палітычным камітэтам (далей – РПК), згодна з якой вайсковая група С.Н. Булак-Балаховіча павінна была стаць фактычна ўзброенымі сіламі РПК. У гэты ж час атрад і сама асоба генерала С.Н. Булак-Балаховіча, які ўжо называў сябе беларусам, прыцягвалі ўвагу некаторых дзеячаў беларускага нацыянальнага руху прапольскай арыентацыі. У верасні – кастрычніку 1920 г. з беларускіх дзеячаў, якія імкнуліся да супрацоўніцтва з генералам С.Н. Булак-Балаховічам, быў створаны Беларускі Палітычны Камітэт (далей – БПК) пад фактычным кіраўніцтвам вядомага беларускага паланафіла П.П. Аляксюка. Падчас Палескага паходу РПК і БПК актыўна змагаліся за ўплыў на С.Н. Булак-Балаховіча і падначаленае яму войска. Удзельнік Палескага паходу 1920 г. польскі афіцэр С. Ліс-Блонскі ўвогуле адзначаў, што «за генералам ішла ўся інтэлігенцыя і найлепшая частка беларускага грамадства» [1, с. 296], аднак гэта з’яўляецца відавочным і неаб’ектыўным перабольшваннем.

Згодна з планамі, распрацаванымі сумесна з польскім камандаваннем, войскі С.Н. Булак-Балаховіча павінны былі захапіць усю тэрыторыю Беларусі, якая знаходзілася пад кантролем бальшавікоў. Падчас сваёй аперацыі генерал марна разлічваў, што значная частка Чырвонай арміі з беларускіх земляў будзе адпраўлена на барацьбу з «белымі» ў Крым або на задушэнне антыбальшавіцкіх паўстанняў ў межах Савецкай Расіі. Вайсковы паход «балахоўцаў» (так называлі вайскоўцаў, якія служылі ў арміі С.Н. Булак-Балаховіча) пачаўся 6 лістапада 1920 г. Падчас наступу ў бальшавікоў былі адбітыя Петрыкаў, Калінкавічы і Мазыр, у якім з дзеячаў БПК быў створаны новы ўрад БНР на чале з В. Адамовічам-старэйшым [6, с. 431]. У той жа час генерал С.Н. Булак-Балаховіч заявіў, што не прызнае ўрадаў А.І. Луцкевіча ў Варшаве і В.Ю. Ластоўскага ў Коўне. Мазырскі ўрад В. Адамовіча заклікаў да барацьбы за незалежнасць Беларусі ў шчыльнай сувязі з Польшчай, а С.Н. Булак-Балаховіч пашырыў беларускую платформу ў сваім дзяржаўным утварэнні, абвясціўшы загад аб фарміраванні беларускай арміі на занятых ім тэрыторыях [10, с. 197–198]. Аднак усе гэтыя захады не здолелі ўратаваць паход «балахоўцаў» ад правалу. Ужо з другой паловы лістапада 1920 г. Чырвоная армія адбівала страчаныя тэрыторыі, а рэшткі войска С.Н. Булак-Балаховіча і мазырскі ўрад вымушаны былі сысці за

дэмаркацыйную мяжу на тэрыторыю Польскай Рэспублікі. Галоўнымі прычынамі паражэння «балахоўцаў» з’яўляліся не толькі адсутнасць палітычнай падтрымкі з боку іншых беларускіх палітычных цэнтраў, недастатковая падтрымка польскімі ўладамі і мясцовым насельніцтвам, але і велізарная няроўнасць сіл і рэсурсаў арміі С.Н. Булак-Балаховіча ў параўнанні з Чырвонай арміяй [2, с. 510].

Нягледзячы на правал паходу Палескага паходу С.Н. Булак-Балаховіча, дадзеная падзея стварыла важны прэцэдэнт для тагачаснай беларускай палітыкі. Як адзначыў гісторык А.М. Чарнякевіч, «у чарговы раз прывід [беларускага] “П’емонту” паўстаў восенню 1920 году», што было звязана, у тым ліку з Палескім паходам [7, с. 29]. Менавіта ў лістападзе 1920 г., хоць на кароткі час, але з’явілася рэальна падпарадкаваная структурам БНР тэрыторыя з насельніцтвам. Пры поспеху авантуры С.Н. Булак-Балаховіча гэтыя землі ў перспектыве маглі б стаць плацдармам для пашырэння ўплыву мазырскага ўрада БНР на іншыя беларускія тэрыторыі. Аднак дзяржаўнае ўтварэнне генерала С.Н. Булак-Балаховіча не стала «беларускім П’емонтам» не толькі па прычыне паражэння паходу «балахоўцаў», але і з-за таго, што не была прызнаным іншымі беларускімі палітычнымі цэнтрамі ў Літве і Польшчы.

Большасць беларускіх арганізацый успрыняла Палескі паход і стварэнне мазырскага ўрада БНР стрымана і нават варожа. Адноўленая ў Вільні газета «Наша Ніва», адным з аўтараў якой у той час быў А.І. Луцкевіч (пад псеўданімам «Ів. Мялешка»), першапачаткова публікавала навіны з Палескага паходу даволі нейтральна, пераважна абмяжоўваючыся сціслымі паведамленнямі пра баявыя дзеянні. Аднак, ужо неўзабаве пазіцыя газеты змянілася, на старонках «Нашай Нівы» пачалася крытыка як «балахоўцаў» увогуле, так і генерала С.Н. Булак-Балаховіча ў прыватнасці. Апошняга крытыкавалі, у тым ліку, за ўжыванне такіх эпітэтаў як «Бацька» і «Вялікі Правадыр». Менавіта са старонак «Нашай Нівы» прагучалі абвінавачанні ў пагромах і рабаваннях насельніцтва «балахоўцамі» падчас Палескага паходу, ставіўся пад сумнеў беларускі характар войска, якое павінна вызваляць Беларусь [9, с. 185–186].

Згодна з успамінамі члена Найвышэйшай Рады БНР К. Цярэшчанкі, беларускія грамадска-палітычныя дзеячы А. Смоліч, Л. Дубейкоўскі і П. Жаўрыд, якія восенню 1920 г. знаходзіліся ў

Варшаве, актыўна пратэставалі супраць дзейнасці БПК, адпаведна не падтрымліваючы і вайскова-палітычную дзейнасць С.Н. Булак-Балаховіча [8, с. 92] . У гэты ж час Найвышэйшая Рада БНР заявіла, што выступленні генерала С.Н. Булак-Балаховіча «вядуцца ім на асабісты страх і адказнасць». Такім чынам, Найвышэйшая Рада заняла нейтральную і чакальную пазіцыю. Разам з тым, згодна заявам, беларускія дзеячы ў Варшаве не выключалі ў далейшым супрацоўніцтва з генералам або яго мазырскім урадам, у залежнасці ад далейшых дзеянняў і палітычнай арыентацыі «балахоўцаў». Асабіста А.І. Луцкевіч у сваім артыкуле «Самазванцы» вельмі крытычна ацаніў дзейнасць С.Н. Булак-Балаховіча і П. Аляксюка, адзначаючы, што іх дзейнасць перашкаджае беларускай справе [4, с. 225]. Такіх поглядаў А.І. Луцкевіч трымаўся фактычна да канца жыцця. На допыце ў кастрычніку 1939 г. былы кіраўнік варшаўскага ўрада БНР назваў С.Н. Булак-Балаховіча «бандытам» і адзначыў, што яго выступленне восенню 1920 г. рыхтавалася польскімі і французскімі спецслужбамі [5, с. 244–245]. Варта адзначыць, што нейкіх гучных заяў адносна паходу С.Н. Булак-Балаховіча ад В.Ю. Ластоўскага, як кіраўніка ковенскага ўрада, у гэты час фактычна не прагучала.

У верасні 1921 г. у Празе адбылася Першая Усебеларуская канферэнцыя, у якой прынялі ўдзел прадстаўнікі розных нацыянальных беларускіх партый і арганізацый, пераважна беларускія эсэры і сацыялісты-федэралісты. У выніку працы канферэнцыі было прынята некалькі рэзалюцый адносна грамадска-палітычнага становішча Беларусі. Адна з рэзалюцый была прысвечана дзейнасці С.Н. Булак-Балаховіча. Згодна з дакументам сцвярджалася, што генерал не мае ніякай падтрымкі з боку беларускіх нацыянальных партый і арганізацый, з’яўляецца ўзурпатарам і авантурыстам. Акрамя таго, канферэнцыя запатрабавала ад вайскоўца апраўданняў за яго дзейнасць [3, с. 271]. З гэтага часу менавіта такая крытычная ацэнка Палескага паходу С.Н. Булак-Балаховіча пераважала ў беларускім эміграцкім асяродку не адно дзесяцігоддзе.

Варта адзначыць, што ў час адступлення арміі С.Н. Булак-Балаховіча з Палесся пачалося ўзброенае паўстанне ў Слуцкім павеце, распачатае пра актыўнай падтрымцы і ўдзеле беларускіх эсэраў. Слуцкае паўстанне было задушана ўжо ў снежні 1920 г., аднак, у адрозненні ад Палескага паходу, выклікала значна больш увагі і

сімпатый з боку беларускай палітычнай эміграцыі. Паступова ў беларускіх эмігранцкіх асяродках за гэтай падзеяй замацаваўся арэол сапраўднай народнай барацьбы за незалежную Беларусь, у той час як паход С.Н. Булак-Балаховіча стаў часцей успрымацца як польскую або польска-расійскую авантуру, толькі часткова здзейсненую беларускімі дзеячамі.

Падсумоўваючы, трэба адзначыць, што члены Найвышэйшай Рады і Народнай Рады БНР сустрэлі весткі аб пачатку паходу С.Н. Булак-Балаховіча стрымана-нейтральна або адмоўна. У далейшым пераважалі ўжо цалкам негатыўны ацэнкі дадзенай падзеі. Варта адзначыць, што нягледзячы на пошук «беларускага П’емонта», большасць беларускіх дзеячаў не пабачыла такой перспектывы за землямі, якія часова аказаліся пад кантролем арміі генерала С.Н. Булак-Балаховіча. Ужо пасля канчатковага паражэння Палескага паходу яго непасрэднага кіраўніка абвінавачвалі ў тым, што ён прасоўваў інтарэсы Польшчы або РПК на беларускіх землях, а таксама жадаў узурпіраваць уладу і «шкодзіў беларускай справе», хаваючыся пад беларускімі сцягамі. Трэба адзначыць, што такое меркаванне не было абсалютным і адзіным, але пераважала ў ацэнках многіх дзеячаў беларускіх эмігранцкіх палітычных цэнтраў і суполак у міжваенны перыяд.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Балахоўцы: сведчанні. Дакументы. Даследаванні / [пераклад, прадмова, каментарыі А. Вашкевіча, А. Чарнякевіча, Ю. Юркевіча]. 2-е выд., дапоўненае і перапрацаванае. Смаленск : Інбелкульт, 2014.

2. Грицкевич, А.П. Западный фронт РСФСР. 1918–1920. Борьба между Россией и Польшей за Белоруссию. Минск : Харвест, 2010.

3. Латышонак, А. Жаўнеры БНР. 3-е выд., перапрацаванае. Смаленск: Інбелкульт, 2014.

4. Луцкевіч, А.І. Барацьба за вызваленне. Вільня [Вільнюс]: Інстытут беларусістыкі: Беласток, Беларускае гістарычнае таварыства, 2009.

5. Луцкевіч, А.І. Да гісторыі беларускага руху. 3-е выд. Смаленск: Інбелкульт, 2015.

6. Міхалюк, Д. Беларуская Народная Рэспубліка ў 1918–1920 гг.: ля вытокаў беларускай дзяржаўнасці: [пераклад з польскай мовы]. Смаленск: Інбелкульт, 2015.

7. Чарнякевіч, А.М. Ідэя «Беларускага П'емонта» і яе рэалізацыя (1919–1921) // Сацыяльна-палітычныя і нацыянальна-канфесійныя трансфармацыі ў Беларусі (канец XIX – пачатак XXI стст.): матэрыялы Міжнароднага круглага стала, Гродна, 18 мая 2018 г. / [рэдкалегія: І. К. Камарова і інш.]. Мінск, 2018. С. 25–30.

8. Чарнякевіч, А.М. Парадоксы ўлады: Беларускі палітычны камітэт і палескі паход генерала С. Балаховіча // Беларусь і суседзі: шляхі фарміравання дзяржаўнасці, міжнацыянальныя і міждзяржаўныя адносіны: зборнік навуковых артыкулаў / Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны. 2014. Вып. 3. С. 90–94.
9. Чарнякевіч, А.М. Чужы сярод чужых: Павел Аляксюк і беларускія «паланафілы». Мінск : А. М. Янушкевіч, 2017.
10. Чернякевич, А.Н. БНР. Триумф побежденных. Минск: А.Н. Янушкевич, 2018.

**УДК 94(476)+94(470+571)**

# ЛАТЫШСКАЯ ДИАСПОРА ВИТЕБЩИНЫ В 1920-е гг.: ВОЗНИКНОВЕНИЕ, СОЦИАЛЬНОЕ ВЗАИМОДЕЙСТВИЕ И ОБЩЕСТВЕННЫЕ ОТНОШЕНИЯ

***Т.В. Буевич***

*Государственный архив Витебской области, ул.Калинина, 22, 210015, г.Витебск, Беларусь, t_buevitch@bk.ru*

В статье рассматриваются причины трансформации латышей Витебщины из национальной группы в диаспору, описываются латышские национальные органы власти, приводятся примеры противостояния латышкой диаспоры и советской власти, противоречий между латышами и представителями других наций в регионах их наиболее компактного проживания.

***Ключевые слова:*** *латыши; национальное меньшинство; мирный договор 11 августа 1920 г.; Рига; Витебская губерния; диаспора; латышский национальный сельский Совет; переписи населения 1920 г., 1926 г.; социально взаимодействие; общественные отношения.*

# ЛАТЫШСКАЯ ДЫЯСПАРА ВІЦЕБШЧЫНЫ Ў 1920-я гг.: УЗНІКНЕННЕ, САЦЫЯЛЬНАЕ ЎЗАЕМАДЗЕЯННЕ І ГРАМАДСКІЯ АДНОСІНЫ

***Т.В. Буевіч***

*Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці, вул.Калініна, 22, 210015, г.Віцебск, Беларусь, t_buevitch@bk.ru*

У артыкуле даследуюцца прычыны ператварэння латышоў Віцебскай вобласці з нацыянальнай групы ў дыяспару, апісваюцца органы латышскай нацыянальнай улады, прыводзяцца прыклады супрацьстаяння латышскай